Алесь КАЎРУС

# СЛОВЫ БЕЗ ПРАПІСКІ

З пачатку 60-х гадоў выпісваю (запісваю) словы з розных крыніц беларускай літаратурнай мовы. Як правіла, тыя, што не трапілі ў вялікія акадэмічныя слоўнікі.

Прыкметна папоўнілася лексіка беларускай мовы апошнімі гадамі. І на гэта ёсць прычыны. Уведзены ў літаратурны і навуковы абыходак шмат якія раней недаступныя выданні, архіўныя матэрыялы. Узнікаюць новыя формы людскіх адносінаў, гаспадарання і кіравання. Карэнныя змены адбываюцца ў свядомасці людзей. Пашыраюцца культурныя і эканамічныя кантакты Беларусі з іншымі краінамі свету. Усё гэта знаходзіць адлюстраванне ў мове, найперш у слоўнікавым складзе. Як і раней, шчодра жывяць літаратурную мову народныя гаворкі. Узбагачаецца лексіка і за кошт вяртання забытых слоў, развіцця новых значэнняў, а таксама ў выніку індывідуальнай моватворчасці пісьменнікаў, журналістаў, навукоўцаў. Такая рознавытокавая і шматстайная лексіка будзе аб'ектам нашай увагі.

Зразумела, і без лексікаграфічнага "ўзаконення", так бы сказаць, без прапіскі шматлікія словы жывуць у мове і выконваюць свае функцыі. Але выяўленне, спарадкаванне і публікацыя іх у выглядзе слоўнікавых артыкулаў можа паспрыяць больш актыўнаму ўвядзенню некадыфікаваных слоў (і значэнняў) у навуковы ўжытак і навучальна-выхаваўчы працэс, у штодзённую моўную практыку.

Прапанаваны да друку лексічны матэрыял можна выкарыстоўваць для правядзення разнастайнай працы па лексіцы, словаўтварэнні, іншых раздзелах беларускай мовы ў сярэдняй і вышэйшай школе, а таксама як даведнік для настаўнікаў-філолагаў. Апрача ўсяго, у носьбітаў роднага слова з'явіцца дадатковая магчымасць пашырыць свой лексікон, яшчэ раз асэнсаваць багаты словатворчы патэнцыял і самахоўчую моц нашай мовы.

Распрацоўка і афармленне слоўнікавых артыкулаў грунтуецца ў асноўным на прынцыпах тлумачальнага слоўніка. Значэнне слоў раскрываецца шляхам кароткага тлумачэння або праз іншае (агульнаўжывальнае) слова — адно ці некалькі. Зважаючы на характар часопіснай публікацыі, варыянты і словаўтваральныя сінонімы падаём у адным загаловачным радку. Часткова выкарыстоўваем адсылкі і спасылкі. Граматычная характарыстыка слоў, граматычныя паметы даюцца паводле ТСБМ.